# РАЗДЗЕЛ 8. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА І АСАБЛІВАСЦІ ЗАХАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ САМАБЫТНАСЦІ ЗА МЯЖОЙ

Галіна Івуць

метадыст аддзела міжнароднай і сацыякультурнай дзейнасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі» (г. Мінск, Беларусь)

## Беларуская дыяспара: гісторыя і сучаснасць. Захаванне спадчыны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Слова дыяспара паходзіць ад грэчаскага *dyaspora*, што азначае раскіданы, размешчаны ў нейкай прасторы паасобку. Прынята лічыць, што дыяспара беларуская — гэта частка беларускага народа, якая жыве па-за межамі Беларусі. Да іх адносяцца таксама і беларусы, якія з'яўляюцца карэнным насельніцтвам памежных краін: Расійскай Федэрацыі (Смаленская вобласць), Латвіі (Латгалія), Польшчы (Беласточчына), Літвы (Віленшчына), Украіны (Палессе). Гэтая этнічная супольнасць валодае нацыянальнай адметнасцю народа: мовай, культурай, але пражывае за рубяжом. Яна захоўвае сваю нацыянальную свядомасць праз суполкі, зямляцтвы, аб'яднанні, рухі. На цяперашні час беларуская сусветная дыяспара налічвае прыкладна 3—3,5 млн беларусаў, што ўяўляе сабою чвэрць нацыі. Прывесці дакладныя звесткі аб колькасці беларусаў у свеце немагчыма, бо ў кожнай краіне існуюць свае прынцыпы ўліку насельніцтва (па гутарковай мове, грамадзянству, краіне паходжання, самавызначэнню, канфесійнай прыналежнасці). Але неабходна адзначыць, што ў апошні час па розных прычынах назіраецца тэндэн-

цыя да змяншэння колькасці беларусаў замежжа. Таму вельмі востра на сённяшні дзень паўстала праблема вывучэння і захавання культурнай спадчыны беларускай эміграцыі.

Ва ўмовах існавання найстаражытнейшых дзяржаўных утварэнняў на тэрыторыі Беларусі (Полацкага і Тураўскага княстваў) за мяжу сыходзілі прадстаўнікі кіруючай эліты, якія былі вымушаны пакідаць родныя мясціны ў сувязі з палітычнымі абставінамі (часцей за ўсё ў выніку паражэння ў барацьбе за ўладу).

У 1529 г. у Статуце Вялікага Княства Літоўскага было замацавана права падданых вялікага князя на вольны выезд за мяжу, як правіла, у Свяшчэнную Рымскую імперыю, Польшчу, Чэхію, Францыю, Іспанію, дзе паступалі на ваенную службу ці навучаліся ва ўніверсітэтах еўрапейскіх гарадоў. Студэнты з шляхецкіх сямей Беларусі і Літвы садзейнічалі распаўсюджанню друкарства і адукацыі (найбольш вядомым стаў Ф. Скарына). Сотні жыхароў Вялікага Княства Літоўскага перасяліліся ў Маскоўскую дзяржаву ў XVII ст. у сувязі з абвастрэннем палітычных, рэлігійных і сацыяльных супярэчнасцей на іх радзіме. У канцы XVI — XVII ст. значная колькасць выхадцаў з Вялікага Княства Літоўскага перасялілася на «вольныя землі» ў нізоўях Дняпра і на Дану, уліўшыся ў склад запарожскага і данскога казацтва.



Буйнамаштабныя высяленні прымяняліся ў адносінах да беларускага насельніцтва у час Лівонскай вайны 1558—1583 гг., вайны паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай 1654—1667 гг. і Паўночнай вайны 1700—1721 гг. Перамешчаныя асобы рассяляліся ў Маскве (у 1672 г. для іх была створана Мяшчанская слабада).

У канцы XVI — XVII ст. беларускія перасяленцы актыўна ўдзельнічалі ў асваенні ўсходніх раёнаў Маскоўскай дзяржавы (Сібіры, Далёкага Усходу, Чукоткі, Камчаткі). У другой палове XV — XVII ст. выхадцы з Беларусі (Пётр Мсціславец, Сімяон Полацкі, Ілля Капіевіч і інш.) спрыялі азнаямленню рускага насельніцтва з дасягненнямі еўрапейскай культуры. Дзясяткі майстроў з Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва і іншых беларускіх гарадоў удзельнічалі ў будаўніцтве храмаў і палацаў на рускай зямлі. Амаль цалкам беларускім па сваім складзе быў калектыў палацавага тэатра, сфарміраванага ў 1673 г. па распараджэнню цара Аляксея Міхайлавіча (акцёры набіраліся ў Мяшчанскай слабадзе). У канцы XVIII ст. — 1870-х гг. беларуская эміграцыя мела палітычны характар. За мяжу ад’язджалі ўдзельнікі паўстанняў 1794, 1830—1831, 1863—1864 гг., у час вайны 1812 г., члены рэвалюцыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таварыстваў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі ў 1820—1870-х гг. Прадстаўнікі гэтай эміграцыйнай хвалі працавалі ў галіне адукацыі і культуры (М.-К. Агінскі, Ф. Дзеружынскі, А. Міцкевіч, Г. Дмахоўскі, Н. Орда, А. Рыпінскі), праславіліся ў галіне навукі і тэхнікі (І. Дамейка, К. Ельскі, І. Граковіч), уключыліся ў вызваленчы і рэвалюцыйны рух на еўрапейскім і амерыканскім кантынентах (Т. Касцюшка, В. Гарноўскі, В. Урублеўскі, З. Мінейка, А. Трусаў, М. Судзілоўскі і інш.).

Асабліва значныя памеры эмігранцкі рух з Беларусі набыў у канцы XIX — пачатку XX ст. Галоўнай прычынай выезду на чужыну было сялянскае малазямелле і неразвітасць на Беларусі буйной прамысловасці. Ехалі на чужыну з мэтай заробку грошай, каб, вярнуўшыся, купіць кавалак зямлі, абзавесціся гаспадаркай. Галоўным чынам эмігранты накіроўваліся ў Германію, Данію, ЗША, Бразілію, Аргенціну і Канаду. У складзе эмігрантаў пераважалі мужчыны ва ўзросце 18—35 гадоў.

Працэс фарміравання дыяспары як сталага пражывання значнай часткі беларускага народа за межамі Бацькаўшчыны пачаўся ў канцы XIX — пачатку XX ст. У Сібіры і сёння можна трапіць у сапраўдную беларускую вёску, якая ўзнікла яшчэ ў час сталыпінскіх рэформ. Тады некаторыя беларускія сем'і паехалі ў Сібір у пошуках зямлі і лепшай долі. Выязджалі цэлымі вёскамі. Да гэтай пары ў іх жыхароў захаваліся звычкі, мова, спевы, абрады, якія перадаваліся ад пакалення да пакалення.



Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і грамадзянская вайна 1918—1922 гг., а таксама баявыя дзеянні, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі ў 1918—1920 гг., выклікалі новы ад'езд насельніцтва за яе межы. У складзе эмігрантаў былі прадстаўнікі інтэлігенцыі, памешчыкі, прадпрымальнікі, сяляне і асобы, прымусова вывезеныя ў 1918 г. на работу ў Германію.

У гады Другой сусветнай вайны працяглая акупацыя тэрыторыі Беларусі абумовіла масавае, галоўным чынам прымусовае, перамяшчэнне яе насельніцтва. У ліку савецкіх ваеннапалонных за мяжой аказаліся сотні тысяч беларусаў, нямала з іх аказаліся вязнямі канцлагераў. У канцы вайны ў адпаведнасці з рашэннем СНК СССР пачалася рэпатрыяцыя савецкіх грамадзян. Але заходнія саюзнікі па антыгітлераўскай кааліцыі не адносілі да падлягаючых рэпатрыяцыі тых асоб, якія да пачатку Другой сусветнай вайны пражывалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў Польшчы (г.зн. у Заходняй Беларусі), прыбалтыйскіх краінах. Так многія беларусы засталіся за мяжой.

Рэгулярны прыток беларусаў і выхадцаў з Беларусі ў заходнія краіны выявіўся ў канцы 1980-х гг. У 1988—1990 гг. з БССР эмігравала больш за 52 тыс. чалавек. У 1991—1995 гг. за межы Рэспублікі Беларусь выехала каля 55 тыс. чалавек — у Ізраіль (50 %), ЗША (32 %), Германію, Аўстралію, Польшчу, Канаду. На 1995 г. па неафіцыйных звестках, каля 500 тыс. беларусаў пражывала ў ЗША, каля 100 тыс. — у Канадзе, дзясяткі тысяч — у Аргенціне, Бразіліі, Францыі, Бельгіі, Германіі, а таксама ў новых цэнтрах беларускай дыяспары — Вялікабрытаніі і Аўстраліі. Прыкладна 250 тыс. беларусаў Беласточчыны апынуліся ў Польшчы пасля вызначэння дзяржаўных граніц.

На постсавецкай прасторы цяпер сканцэнтравана пераважная большасць усіх замежных беларусаў. На сённяшні дзень найбольш буйныя аб'яднанні беларусаў знаходзяцца ў Расійскай Федэрацыі (810 тыс. беларусаў), Украіне (275 тыс. чалавек), Казахстане (111 тыс. беларусаў), Латвіі (90 тыс. чалавек), Літве (42,5 тыс. беларусаў), у Эстоніі (21,3 тыс. беларусаў).



Сярод беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі за рубяжом былі і ёсць выдатныя дзеячы ў самых розных сферах жыцця — ад палітыкі і эканомікі да культуры і мастацтва. Дастаткова прыгадаць лаўрэата Нобелеўскай прэміі Жарэса Алфёрава і Міністра замежных спраў СССР Андрэя Грамыку, касманаўтаў Пятра Клімука, Уладзіміра Кавалёнка і Алега Навіцкага, навукоўцаў Бенедыкта Дыбоўскага і Яна Чэрскага, мастакоў Марка Шагала і Хаіма Суціна.

Беларусь дала свету многа таленавітых суайчыннікаў, імёны якіх увайшлі ў энцыклапедыі і біяграфічныя слоўнікі. Сярод іх нацыянальны герой ЗША Тадэвуш Касцюшка, царкоўны і асветніцкі дзеяч Францішак Дзеружынскі, лекар і грамадскі дзеяч Мікалай Судзілоўскі, нацыянальныя героі Чылі і Грэцыі Ігнат Дамейка і Зыгмунт Мінейка, вядомы фізік Барыс Кіт, дзеячы культуры Тамара Стагановіч, Алесь Ахола-Вало, Міхась Забэйда-Суміцкі, Майсей Сяднёў і многія іншыя. Але на працягу дзесяцігоддзяў навуковай і культурнай спадчыны яны вядомы як прадстаўнікі іншых краін. З роду беларускіх паўстанцаў паходзяць вядомы дзяржаўны дзеяч Грэцыі Андрэас Папандрэу, знакаміты французскі паэт Гіём Апалінэр.

У эміграцыі многія беларусы здолелі раскрыць свой талент, арганізацыйныя здольнасці. Ацаніць іх уклад у развіццё навукі і куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры свету, знайсці для іх адпаведнае месца ў гістарычнай прасторы — задача, якая доўгі час была невырашальнай. З 1990-х гг. пачалі ўсталёўвацца кантакты паміж Беларуссю і яе дыяспарай. Пачала збірацца інфармацыя пра выбітных беларусаў за мяжой, якія ўнеслі свой уклад у сусветную культуру. Гэта, напрыклад: Аляксандр Надсан — у Англіі, Янка Запруднік і Вітаўт Кіпель — у ЗША, Алесь Алехнік — у Аўстраліі, Раіса Жук-Грышкевіч і Кастусь Акула — у Канадзе, Зоя Смаршчок і Лаўрэн Клыбік — у Бельгіі, Аляксандр Баршчэўскі і Чэслаў Сэнюх — у Польшчы, Хведар Нюнька і Галіна Войцік — у Літве, Вячка Целеш і Станіслаў Валодзька — у Латвіі, Валянцін Грыцкевіч, Аляксей Каўка — у Расіі і інш.

У 2014 г. падрыхтаваны энцыклапедычны даведнік «Сузор'е беларускага памежжа: беларусы і народжаныя ў Беларусі ў суседніх краінах». У ім сабраны звесткі пра 1650 суайчыннікаў, якія ўнеслі свой уклад у развіццё дзяржаўнага, сацыяльнага, эканамічнага і культурнага жыцця памежных краін і праславілі сваю Бацькаўшчыну.



Замежныя беларусы неаднаразова спрабавалі стварыць свае музеі і архівы, аднавіць Беларускі музей у Вільні, Беларускі замежны архіў у Празе ў міжваенны час, якія былі знішчаны ў гады Другой сусветнай вайны. Зараз у Лондане існуе Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны, у Польшчы — Гайнаўскі музей. Адным з важных кірункаў работы з беларускім замежжам з'яўляецца садзейнічанне і падтрымка дзейнасці ствараемых і існуючых культурных цэнтраў Беларусі за мяжой. На сённяшні дзень працуюць 17 цэнтраў беларускай культуры за рубяжом: цэнтр беларускай культуры ў Азербайджане, цэнтр беларускай культуры імя Кастуся Каліноўскага ў Аргенціне (г. Буэнас-Айрэс), Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны ў Вялікабрытаніі (г. Лондан), Беларускі Інстытут навукі і мастацтва ў ЗША (г. Нью-Ёрк), Цэнтр беларускай культуры ў Латвіі (г. Даўгаўпілс), Беларускі культурны цэнтр у Рызе, Беларуская сярэдняя школа імя Францыска Скарыны ў Літве (г. Вільнюс), Культурны цэнтр Беларусі ў Варшаве, Новасібірскі цэнтр беларускай культуры, Культурны цэнтр Беларусі ў Францыі (г. Парыж) і інш.

Грамадскі рух суайчыннікаў за мяжой знаходзіцца на этапе пэўных структурных і якасных змяненняў. Расце колькасць грамадскіх беларускіх арганізацый у краінах СНД, Балтыі, пашыраюцца кірункі іх дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне, навуковае асэнсаванне культурных здабыткаў беларускай дыяспары, сістэматызацыя і пашырэнне звестак пра яе асноўных дзелавых і інтэлектуальных прадстаўнікоў патрэбны нашай грамадскасці па некалькіх прычынах. Першая — прыцягненне магутнай сілы да ажыццяўлення эканамічных і культурных праграм Рэспублікі Беларусь. Другая — дастойнае беларускае прадстаўніцтва за рубяжом, у краінах пражывання, узмацненне нашай прысутнасці, найперш культурнай, у свеце. Урэшце, ва ўмовах, калі тысячы прадстаўнікоў беларускага народа па розных прычынах былі вымушаны працаваць на карысць іншых народаў і краін, памяць пра іх мае не толькі навуковую каштоўнасць, але і выхаваўчае значэнне для будучых пакаленняў.

Беларуская дыяспара з’яўляецца неад’емнай часткай беларускай нацыі, захавальнікам яе гісторыі і культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ